УДК 398.85:355(476)

# ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ ЖАНРАВЫХ РАЗНАВІДНАСЦЕЙ І АДМЕТНАСЦЕЙ КЛАСІФІКАЦЫІ КАЗАЦКІХ, РЭКРУЦКІХ І САЛДАЦКІХ ПЕСЕНЬ

*канд. філал. навук, дац. Л.М. ЛУЦ*
*(Бабруйскі філіял "УА БДЭУ")*

*Даследуецца праблема жанравых разнавіднасцей і адметнасцей класіфікацыі беларускіх казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень. Сістэматызацыя сюжэтаў гэтых песень і іх ідэйна-мастацкі аналіз дазволілі вызначыць агульныя жанраўтваральныя рысы казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень, улічваючы пры гэтым блізкасць тэматыкі, факт сацыяльнай прыналежнасці, ваенны фактар як з'яву аб'ектыўнай рэальнасці, асаблівасці мастацкага асэнсавання з'яў навакольнага свету. Дадзеныя творы – гэта своеасаблівыя жанравыя разнавіднасці сацыяльна-бытавых песень, але ў сукупнасці яны складаюць цэласную з'яву ў гісторыі фалькларыстыкі. Прапанавана агульная класіфікацыя казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень паводле функцыянальна-тэматычнага прынцыпу (вылучаны творы сямейна-бытавой, сацыяльна-бытавой, гістарычнай і баладнай скіраванасці). Такі прынцып пабудаваны з улікам тэматыкі, сюжэтнасці, кампазіцыйных асаблівасцей, сістэмы вобразна-выяўленчых сродкаў і песеннай функцыянальнасці.*

**Уводзіны.** Казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні здаўна прыцягвалі пільную ўвагу збіральнікаў і даследчыкаў, аднак адсутнасць класіфікацыі і нявылучанасць матэрыялу ўскладнялі мэтанакіраванае іх вывучэнне. У даследуемым песенным фальклорным жанры галоўнымі з'яўляюцца фіксацыя і захаванне для нашчадкаў найбольш значных момантаў гісторыі, характарыстыка тых гістарычных асоб, якія з той ці іншай нагоды запомніліся народу. Песні ўспрымаліся як своеасаблівыя апавяданні аб рэальных падзеях, таму фальклорны тэкст можна разглядаць як рэчаіснасць, як абрад ці сацыяльна-бытавы інстытут.

**Асноўная чачтка.** У беларускай фалькларыстыцы казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні традыцыйна адносяць да сацыяльна-бытавой лірыкі, якая адлюстроўвае грамадскія адносіны і сацыяльны пратэст прыгнечанага народа ў розныя гістарычныя часы. Звычайна творы класіфікуюцца па ідэйна-тэматычным прынцыпе. Як падкрэслівае Г. Пятроўская, «сацыяльна-бытавымі іх можна ў нейкай ступені назваць умоўна, таму што сацыяльныя адносіны даволі яскрава раскрываюцца і ў шматлікіх песнях земляробчага календара – <...>, у пазаабрадавых – любоўных, сямейна-бытавых» [1, с. 244]. У айчыннай фалькларыстыцы не разглядалася праблема класіфікацыі і жанравых межаў казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень. Яны прадстаўляюць шырокі пласт беларускай вусна-паэтычнай песеннай творчасці і разглядаюцца даследчыкамі ў складзе розных жанра-відавых межаў.

Шэраг казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень аналізуе ў раздзеле «Песні эпічнага і ліра-эпічнага складу» Н. Гілевіч [2, с. 95]. Ён класіфікуе іх як гістарычныя і сацыяльна-бытавыя і характарызуе як маршавыя, для паходу. Даследчык сцвярджае, што мужчынскіх вайсковых песень, якія былі складзены і выконваліся вайскоўцамі ў беларускім народна-песенным рэпертуары, вельмі мала. У зборніку «Лірычныя песні» ён змяшчае казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні ў раздзеле «Песні пра службу ў войску», аднак пазначае, што гэта песні не ўласна вайскоўца, а песні «пра вайскоўца: пра яго жыццё і службу, пакуты і смерць, думае і гаворыць, спагадаючы і аплакваючы не толькі яго лёс, але і свой, беларуская жанчына» [3, с. 49]. Параўноўваючы казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні з сямейна-бытавой лірыкай, Н. Гілевіч падкрэслівае іх «паважаны ўзрост» і стылёвую блізкасць да песеннай паэзіі абрадавых цыклаў [3, с. 50].

У зборніках вусна-паэтычных твораў фалькларысты да казацкай песні далучаюць гістарычныя песні (казацкай вольніцы), сацыяльна-бытавыя казацкія песні, любоўна-лірычныя песні, у якіх галоўнай дзеючай асобай, героем выступае казак, а таксама некаторыя балады. У кнізе «Беларуская вусна-паэтычная творчасць» (аўтары К. Кабашнікаў, А. Фядосік, А. Ліс і інш.) казацкія песні аднесены да гістарычнай паэзіі беларускага народа, якая ўзнікла ў працэсе барацьбы супраць польска-каталіцкай агрэсіі [4, с. 302 – 303]. У чацвёртым выданні хрэстаматыі «Беларускі фальклор» [5] у раздзеле «Пазаабрадавыя песні» падаецца разрад салдацкіх і казацкіх песень і асобна выдзяляюцца «гістарычныя песні, творчасць рабочых, паэзія змагання», да якіх далучаны і казацкія песні гістарычнага зместу.

Казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні можна знайсці і ў сучасных фальклорных зборніках у раздзеле «пазаабрадавая паэзія», напрыклад, у шматтомным зборніку «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» [6]. Аўтар названага раздзела К. Кабашнікаў уключае «рэкруцкія і салдацкія песні, звязаныя з рускай фальклорнай традыцыяй», у склад гістарычных [6, с. 344]. В. Захарава ў зборніку «Беларускі фальклор у сучасных запісах» змясціла казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні ў адным раздзеле [7, с. 180]. Такая неакрэсленасць жанрава-відавых асаблівасцей уяўляе сабой адну з асноўных цяжкасцей пры вывучэнні казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень. Так, напрыклад, У. Проп у сваім артыкуле «Жанравы склад

рускага фальклору» вылучаў у асобны жанр песні, складзеныя ў асяроддзі казакоў у XVI – XVII стагоддзях, і характарызаваў іх як песні пра атаманаў, правадыроў казацкай вольніцы і пра сялянскія войны. Ён падкрэсліваў, што выкананню такіх песень характэрна працяжнасць, і яны з'яўляюцца харавымі. Але У. Проп не вылучаў песні казакоў з групы песень «сялян, што адарваліся ад земляробчай працы» [8, с. 56]. У слоўніку навуковай і народнай тэрміналогіі «Усходнеславянскі фальклор» сцвярджаецца, што «...адлюстраваныя імі (казацкімі песнямі. – *Л. Л.*) карціны казацкага побыту, воінскага асяроддзя, матывы гераікі набліжаюць казацкія песні да гістарычных песень» [9, с. 206]. Што тычыцца рэкруцкіх і салдацкіх песень, то У. Проп адзначаў наступнае: «Пачынаючы з часу стварэння рэгулярнай арміі, у фальклоры з'яўляецца асобны від гістарычных песень, складзеных салдатамі. Гэта воінскія гістарычныя песні XVIII – XX стагоддзяў Гэты від гістарычнай песні паступова становіцца дамінуючым. Пачынаючы з песні пра Палтаўскі бой, рускі салдат суправаджае песнямі ўсе войны: Сямігадовую вайну, вайну 1812 – 1815 гадоў, Крымскую кампанію, турэцкія войны, вайну з Японіяй, а таксама больш дробныя паходы... Па стылі яны набліжаюцца да бытавых салдацкіх лірычных песень, але разам з тым істотна адрозніваюцца ад іх» [8, с. 62 – 63].

Разглядаючы асаблівасці беларускай казацка-сялянскай лірыкі, Л. Мухарынская сцвярджае, што гэта новы песенны пласт сацыяльнай лірыкі і гераічнага эпасу, «паэтыка-музычны воблік якіх істотна адрозніваецца ад стылю земляробчых песень». Паводле яе меркавання, менавіта ў той перыяд фарміраваўся новы песенны пласт «з абсалютна своеасаблівай стылістыкай – казацкай харавой шматгалоснай песні». Пачатак фарміравання гэтага стылю аўтар адносіць да XVI – XVII стагоддзяў і лічыць, што ў дадзены перыяд «рысы грамадскага побыту казацтва вызначыліся з пэўнай устойлівасцю» [9, с. 100].

На думку Г. Пятроўскай, такое фарміраванне стылю казацкай харавой песні можна аднесці не да ўсіх груп казацкіх песень, а толькі да казацкіх гістарычных песень, якія былі прысвечаны пэўным гістарычным асобам, бітвам. Даследчыца вылучае шматлікія тэматычныя падгрупы лірычных казацкіх песень: любоўныя, ліра-эпічныя баладнага тыпу, сямейныя песні, пра трагічную гібель казака ці яго жонкі (дзяўчыны) у выніку складаных сямейных адносін. Размеркаванне песень складальнікамі зборнікаў, дзе галоўным героем быў казак, то да любоўных, то да казацкіх Г. Пятроўская тлумачыць тым, што «вобраз казака мае вялікую ёмістасць, у якім увасобіліся шырока абагуленыя рысы, характэрныя і для казака, і для любога іншага, як кажуць, добрага "малайца". Слова "казак" у народзе, у народных песнях заўсёды асацыіруецца з уяўленнем аб смелым, знаходлівым, вельмі мужным і прыгожым маладым хлопцы» [1, с. 295].

Даследчыца З. Мажэйка вылучае дзве тэматычныя групы казацкіх песень: «песні з уласна казацкай тэматыкай і характэрнымі "казацкімі" вобразамі (казак і паход, казак і яго верны конь, казацкая адвага, казацкая нядоля) і лірычныя песні пра каханне, дзе казак – традыцыйны вобраз мілага» [10, с. 97]. Яна падкрэслівае «старажытныя вытокі любоўных песень з казацкай тэматыкай і выяўляе іх сувязі з ранняй музычна-паэтычнай традыцыяй, у прыватнасці з каляндарна-абрадавай паэзіяй» [1, с. 295].

Што датычыцца рэкруцкіх і салдацкіх песень, то Я. Карскі вызначыў іх пяць асноўных тэматычных груп, ахарактарызаваў іх змест, зыходзячы з паэтапнага асэнсавання падзей набору, провадаў і ўдзелу ў баявых дзеяннях: «а) паступленне на службу; б) падрыхтоўка да паходу салдатам-навабранцам: купля каня, падбор адзення, сядланне каня – усё суправаджаецца плачам родных; в) хлопца, які ад'язджае на вайну, праклінае маці, таму што ён пайшоў супраць яе волі; г) смерць салдата ў полі; д) салдат забівае брата салдата з рэўнасці, таму што яны закаханы ў адну і тую ж дзяўчыну» [11, с. 361 – 362]. Аналізуючы рэкруцкія і салдацкія песні па ідэйна-тэматычным прынцыпе, іх можна сістэматызаваць у наступныя групы: набор у рэкруты; сацыяльны пратэст у сувязі з несправядлівым выбіраннем рэкрута з беднай сям'і; развітанне рэкрута з бацькамі, жонкай, каханай; горкая доля рэкрута; паводзіны ў «прыёме», «галенне» ілба; горкія пачуцці маці, жонкі, дзяўчыны ў час провадаў рэкрута; муштра ў царскай арміі; трагічны лёс рэкрута, салдата. У гэтым кантэксце Г. Пятроўская падкрэслівае, што «ў песнях рэалістычна і паслядоўна адлюстроўваюцца ўсе этапы набору рэкрутаў: паведамленне пра царскі ўказ; абмеркаванне яго мясцовымі ўладамі; выбар сям'і, з якой мяркуецца ўзяць рэкрута; вызначэнне канкрэтнай асобы, прызначанай для набору; прымусовае адпраўленне навабранца на прыёмны пункт; абследаванне яго камісіяй і яе рашэнне» [1, с. 306]. Сюжэты і матывы гэтых песень часам пераплятаюцца, што тлумачыцца кантамінацыяй, трансфармацыяй сюжэтаў такіх песень у працэсе бытавання.

Пад гістарычнымі падзеямі разумеюцца значныя з'явы, факты грамадскага і асабістага жыцця, таму нельга не пагадзіцца з высновай даследчыкаў С. Барыса і В. Чаропкі аб тым, што казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні з'яўляюцца разнавіднасцю гістарычных песень. Такую няпэўную класіфікацыю яны тлумачаць тым, што «дарэвалюцыйныя, савецкія і сучасныя фалькларысты адносілі песні да той ці іншай групы ў адпаведнасці з тым, як іх вызначалі самі выканаўцы. Непісьменныя або малаадукаваныя людзі песні пра гістарычныя падзеі ніяк не вылучалі і выконвалі іх "абы-як" і пра гэта паведамлялі збіральніку фальклору"» [12, с. 38]. Можна згадзіцца і з меркаваннямі В. Чычарава, які лічыць, што гістарызм дадзеных твораў заключаецца не ў тым, што ў іх дакладна адлюстраваны гістарычныя асобы і падзеі, а ў тым, што ў гэтых песнях народ выказвае свае адносіны да гістарычных падзей, асоб і абставін [13].

Галоўная роля па вывучэнні народнага менталітэту XVII – XVIII стагоддзяў, паводле Л. Пушкарова, належыць таксама гістарычнай песні [14, с. 87]. На погляд І. Насовіча, пры класіфікацыі песень неабходна зыходзіць «ад абставін грамадскага жыцця» і «ад абставін сямейнага жыцця» [15]. Працягваючы гэтую думку, У. Сядзельнікаў пісаў: «Чалавек спявае пра тое, што больш за ўсё яго прыцягвае, хвалюе, бо, адлюстроўваючы адмоўныя бакі народнага жыцця, песня <...> указвала на вытокі, якія іх нарадзілі. Песня садзейнічала разбурэнню старых феадальных парадкаў у побыце, дапамагала падрываць асновы прыгону і капіталістычнага ладу» [16, с. 15]. Самай істотнай групай крыніц па вывучэнні менталітэту сялянства XVIII ст, як сцвярджае Л. Пушкароў, з'яўляюцца фальклорныя запісы, якія захавалі мноства «разнастайных выразаў, адлюстравалі погляд простага народа на рэчы, падзеі, з'явы і ўзбагацілі агульналітаратурную мову сакавітымі і вобразнымі выразамі» [17, с. 79].

Даследчык І. Сянько лічыць, што «тэрмін "гістарычная песня" ўспрымаецца ў шырокім і вузкім сэнсе: у шырокім – гэта песня аб тых ці іншых з'явах народнага жыцця, аб тым ці іншым руху насельніцтва; у вузкім – гэта песня аб гістарычных падзеях і пэўных асобах, якія прымалі ў іх удзел» [18, с. 9]. Прыхільнікі першага погляду ў разрад гістарычных залічваюць і казацкія, і баладныя, і лірычныя салдацкія песні, «калі знаходзяць у іх водгукі гісторыі» [18, с. 9]. Такім чынам, ніжэйшая мяжа гістарычных песень мае даволі шырокі дыяпазон. Аднак даследчык падкрэслівае, што «незамкнутасць сістэмы паэтычнай мовы гістарычных песень фалькларысты разглядаюць як жанраўтваральную. Таму гістарычныя песні групуюцца не столькі па фармальных прыкметах, колькі з улікам іх зместу» [19, с. 143]. На думку І. Сянько, песні аб пэўных гістарычных падзеях неаднастайныя, разнатыпныя, таму ёсць магчымасць прасачыць за рэальным удзелам у гэтых падзеях канкрэтных існуючых асоб. Аўтар справядліва акрэслівае фармальна-змястоўныя магчымасці гістарычных песень – «ад падзейных твораў да эмацыянальнай рэакцыі на падзеі, г. зн. звужэнне фактычнай асновы сюжэту і ўзрастанне ролі лірычнага пачатку» [18, с. 10]. Як адзначае Г. Пуцілаў, «гістарычная песня – гэта перш за ўсё твор мастацтва, а не дакумент, які атрымаў песенную форму: "не ў эмпірычна-дакладным, а менавіта ў па-мастацку выдуманым аднаўленні падзей заключаецца сіла і праўда гістарычнай песні"» [20, с. 69 – 70]. У адпаведнасці з гэтым акцэнт робіцца на вывучэнні сюжэта і на супастаўленне яго з жыццём.

Згаданыя тэарэтычныя палажэнні сведчаць, што вывучэнне ўплыву ваеннага фактару на штодзённае жыццё беларускага грамадства і адлюстраванне яго ў песнях уяўляе несумненную цікавасць і мае навуковую навізну. «*Вайсковы фактар*» (войны, узброеныя канфлікты, ваенна-мабілізацыйная дзейнасць дзяржавы) і сёння непасрэдна ўздзейнічае на грамадства і на паўсядзённае жыццё асобнай сям'і. Аднак народ жыў і жыве не толькі гістарычнымі падзеямі, але і сваім звычайным жыццём.

Паняцце «штодзённасць» уведзена ў сусветную гістарычную навуку французскай Школай Аналаў, прадстаўнікі якой у сваю чаргу пачалі даследаванні адначасова з узнікненнем «*этнаметадалогіі*» ці, як яе зараз называюць, «*сацыялогіі паўсядзённасці*» (*everyday life, Alltagsleben, la vie quotidienne*). Даследчыкі імкнуліся не да аднаўлення асобных бакоў рэчаіснасці, а да стварэння цэласнага ўяўлення аб жыцці людзей з іх звычкамі адчуваць, думаць, спосабамі барацьбы з абставінамі. Праблему «*штодзённага жыцця*» (*Alltagsleben*) комплексна даследаваў нямецкі гісторык А. Людтке, працы якога дазваляюць ацаніць метадалагічныя кірункі і гістарыяграфічны дыскурс сучаснай заходняй гістарычнай навукі [21, с. 45]. Гісторыя штодзённасці ўяўляецца нам гісторыяй падрабязнасцей жыцця – побыту, адпачынку, працы, гендэрнай гісторыі. Гэта яшчэ і гісторыя паўсядзённых перажыванняў простых людзей, аналіз іх паводзін. Ці ўплываў на штодзённасць і на яе структуру (сям'ю, хатнюю гаспадарку, індывідуальнае, прыватнае жыццё) вайсковы (ваенны) фактар? Несумненна.

Адным з першых, хто закрануў праблему ўздзеяння вайсковай справы на паўсядзённае жыццё народаў, быў нямецкі даследчык М. Іенс. На яго думку, «паміж вайсковымі ўстановамі і бытавым жыццём народа, гэта значыць агульным станам нацыі, існуе самая цесная сувязь» [22, с. 63].

Казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні ў большай ступені, чым іншыя жанры беларускай народнай лірыкі, у сваім змесце пэўным чынам адлюстроўваюць штодзённую і ваенную гісторыю. Гэта асаблівасць абумоўлена заканамернасцямі развіцця лірычных жанраў фальклору, іх цеснай сувяззю з жыццём і светасузіраннем народа, стасункамі з рэчаіснасцю. Навуковец С. Лазуцін адзначае, што «...неадступна ідучы за гісторыяй, на кожным гістарычным этапе песня адлюстроўвае галоўнае ў жыцці і светапоглядзе народа, яна заўсёды змяняецца ў дакладнай адпаведнасці з тымі зменамі, якія адбываюцца ў жыцці і светапоглядзе народа» [23, с. 274]. Гэтую ж думку пацвярджае і развівае Б. Пуцілаў: «Гісторыя апярэджвае не толькі змест, але і структуру ў цэлым вызначаных жанраў, якія і ўзніклі, і развіліся ў сувязі з аб'ектыўнай неабходнасцю мастацкага асэнсавання, абагульнення, адлюстравання гісторыі. Жанры гэтыя – заканамерная форма адлюстравання гістарычнай свядомасці калектыву, форма своеасаблівага замацавання яго гістарычнай памяці, здзяйснення гістарычных памкненняў» [20, с. 224 – 227]. Даследуючы беларускія песні, П. Ахрыменка адзначаў у іх сінтэз ваеннага фактару і паўсядзённасці: «У XVIII і асабліва ў XIX стагоддзі гістарычныя песні сталі інтэнсіўна зліваецца з казацкімі і салдацкімі песнямі, якія мелі ў ас-

ноўным лірычны характар» [24, с. 33]. У раздзеле «Сацыяльна-бытавая лірыка» шматтомнага навуковага выдання «Беларусы» падкрэслена, што «адлюстраванне гістарычных і сацыяльных з'яў і падзей можна лічыць "рэалістычнымі ў сацыяльна-бытавых, а канкрэтна ў казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песнях"» [25, с. 318].

У даследуемым песенным фальклорным жанры галоўнымі з'яўляюцца фіксацыя і захаванне для нашчадкаў найбольш значных момантаў гісторыі, характарыстыка тых гістарычных асоб, якія з той ці іншай нагоды запомніліся народу. Яшчэ М. Карамзін падкрэсліваў: «Сведкі распавядаюць, дзеці і ўнукі іхнія спяваюць аб падзеі» [26, с. 290]. Песні ўспрымаліся як своеасаблівыя апавяданні аб рэальных падзеях. Фальклорны тэкст, як правамерна лічыць Б. Пуцілаў, – «такая ж рэчаіснасць, як абрад ці сацыяльна-бытавы інстытут» [27, с. 186]. Пры ўсёй мастацкай умоўнасці і абагуленасці адлюстравання падзей і асобы некаторыя казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні зусім канкрэтныя ў паказе многіх аспектаў, звязаных з баявымі справамі герояў. Так, у іх можа канкрэтна называцца мясцовасць, падзеі могуць адбывацца каля рэк: «*за Дунаем*», «*на Дану*», «*на Прыпяці*», у дзяржаўна-гістарычных аб'яднаннях: «*Расея*», «*Украіна*», геаграфічных раёнах: «*Каўказ*», «*турэцкая зямля*», асобных гарадах і вёсках: «*Кіеў*», «*Піцер*», «*Беласток*», «*Царскае Сяло*» і інш.

Спецыфіка зместу песень аб ваенных падзеях вызначаецца наяўнасцю дзеючых асоб, абавязковых герояў-вайскоўцаў і інш. Гэта можа быць абстрактная асоба: «*казак*», «*салдат*», «*рэкрут*», «*удовій сын*», «*малодшы сын*», «*улан*», «*жаўнер*», «*барабаншчык*», а могуць быць прадстаўнікі жывёльнага ці раслiннага свету: «*сокал*», «*голуб*», «*дубчык*», «*бяроза*», прадстаўнікі кіруючых колаў: «*белы цар*», «*царыца наша маць*», «*царова маці*», агульныя назвы дзеючых асоб, аб'яднаных тэрыторыяй: «*маскалі*», «*туркі*», «*поляченьки*», «*ляхі*», канкрэтныя гістарычныя асобы: «*Платаў*», «*Касцюшка*», «*Пётр I*». Па ідэйна-эмацыянальным змесце беларускія песні пра службу ў войску з'яўляюцца непасрэдным працягам сацыяльных песень нядолі. Асноўныя іх матывы – нягоды і выпрабаванні, што выпадалі на долю простага чалавека, учарашняга селяніна, на вайсковай службе, трагізм яго лёсу і перажыванні родных (асабліва маці і жонкі), народнае ўспрыманне вайны як з'явы антыгуманнай, якая калечыць і знішчае самае каштоўнае на зямлі – жыццё чалавека.

У гэтым сэнсе слушныя меркаванні Н. Гілевіча, які падкрэсліваў цесную сувязь народных балад з гістарычнымі песнямі: «Балада, як і гістарычная песня, азначала ў народнай паэзіі паварот да канкрэтнай чалавечай асобы, да яго прыватнага жыццёвага лёсу...» [2, с. 109]. Даследчык выказаў важную думку: калі «ў гістарычных песнях гаворыцца звычайна пра асоб выдатных і гістарычна рэальных, то для балады гэта правіла зусім неабавязковае» [2, с. 109 – 110]. Сапраўды, шмат баладных сюжэтаў адпавядае сюжэтам казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень. Адзначаныя песні і балады ў цэнтр увагі ставяць лёс чалавека, скрозь прызму якога і адлюстроўваюцца падзеі агульнанароднага значэння, этычныя, сацыяльныя, філасофскія і таксама палітычныя праблемы. Пастаноўка ж пытання аб адрозненні думак і пачуццяў людзей у мінулыя эпохі ад уласцівых нашаму часу, аб абумоўленасці светаўспрымання матэрыяльнымі ўмовамі жыцця, рэлігіяй і іншымі фактарамі – адна з задач даследавання. З дапамогай казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень можна зразумець «дух» (*esprit*) эпохі, яе «разумовы інструментарый» (*outillage mental* – тэрмін уведзены Л. Феўрам) [28, с. 43].

Наогул даследчыкі выказваюць думку, што канчатковае афармленне жанру неабрадавай традыцыйнай лірычнай песні, выпрацоўка жанрам тых ідэйна-мастацкіх якасцей і сродкаў, якія знаходзяцца ў песнях, запісаных прыблізна за два апошнія стагоддзі, адносяцца да XVI – XVII стст. І казацтва, і рэкруцтва, і салдацтва ў XVIII – XIX стагоддзях уяўлялі сабой новую значную сацыяльную групу са спецыфічнымі ўмовамі побыту. У сувязі з гэтым і з'яўляюцца ў народнай вусна-паэтычнай творчасці казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні. Іх тэматыка шматвобразная, а вызначальнай рысай, як справядліва адзначае Г. Пятроўская, «з'яўляецца такое адлюстраванне рэчаіснасці, якое непасрэдна паказвае сацыяльную прыналежнасць герояў песень і сацыяльнае асяроддзе, у якім яны дзейнічаюць» [1, с. 245].

**Высновы.** Адзначаныя песні ў цэнтр увагі ставяць лёс асобнага чалавека, скрозь прызму якога і адлюстроўваюцца падзеі агульнанароднага значэння, этычныя, сацыяльныя, філасофскія і палітычныя пытанні. З дапамогай даследуемых песень можна зразумець думкі, пачуцці і ўяўленні людзей у мінулыя часы – гэта так званы «дух» эпохі, яе «разумовы інструментарый».

Казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні ў фалькларыстыцы разглядаюцца як у звязцы, так і ў якасці абсалютна самастойных жанравых адзінак. У выніку даследавання праблемы жанравых разнавіднасцей дадзеных песень можна вылучыць іх агульныя жанраўтваральныя рысы:

- фармальна-змястоўная напоўненасць (па тэматычным прынцыпе гэта песні пра казакоў, рэкрутаў, салдатаў);
- сацыяльная прыналежнасць, ці гарызанталь бытавання (гэта песні вайскоўцаў – казакоў, рэкрутаў, салдатаў);
- функцыянальная накіраванасць (адлюстраванне ў песнях уплыву ваеннага фактару на штодзённае жыццё грамадства: ваеннага асяроддзя, побыту, адпачынку, перажыванняў, працы, гендэрнай гісторыі);

- па мастацкім асэнсаванні рэчаіснасці назіраецца перавага матываў драматызму, смерці, героікі;
- агульныя стылістычна-паэтычныя сродкі;
- звужэнне фактычнай асновы сюжэта большасці песень і ўзрастанне ў іх ролі лірычнага пачатку.

Паводле родавай прыналежнасці і з улікам тэматычнага, сацыялагічнага і эстэтычнага падыходаў казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні можна згрупаваць і разглядаць іх як адно цэлае, як адзіны жанр.

Здольнасць казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень функцыянаваць у межах розных жанраў дазволіла ўжо першым збіральнікам сярэдзіны XIX стагоддзя змяшчаць іх сярод сямейна-бытавых, лірычных, баладных, гістарычных, любоўных і іншых песень. Аналізуючы змест казацкіх, рэкруцкіх і салдацкіх песень на аснове функцыянальна-тэматычнага прынцыпу, іх можна ўмоўна размеркаваць на чатыры групы:

- казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні сямейна-бытавой скіраванасці, у якіх яскрава выражаны лірычны пачатак – эмацыянальны ўнутраны стан, перажыванні герояў, любоўныя і сямейныя адносіны;
- казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні сацыяльна-бытавой скіраванасці, якія адлюстроўваюць грамадскія адносіны, сацыяльны пратэст народа, фіксуюць асаблівасці традыцый, звычаяў і побыту беларускага грамадства;
- казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні гістарычнай скіраванасці, якія адлюстроўваюць пэўныя гістарычныя падзеі, характарызуюць рэальных асоб;
- казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні баладнай (ліра-эпічнай) скіраванасці, якія знаходзяцца на мяжы з сацыяльна-бытавымі і гістарычнымі.

Сістэмна-гістарычны падыход дазваляе ідэнтыфікаваць неабходны і дастатковы комплекс песенных характарыстык, якія ў сукупнасці і складаюць даследуемы жанр – казацкія, рэкруцкія і салдацкія песні як цэласны аб’ект.

## ЛІТАРАТУРА


1. Пятроўская, Г.А. Сацыяльна-бытавая лірыка / Г.А. Пятроўская // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Кн. 3: Пазаабрадавая паэзія / А.І. Гурскі, Г.А. Пятроўская, Л.М. Салавей; навук. рэд. А.С. Фядосік. – С. 244 – 423.
2. Гілевіч, Н.С. Наша родная песня: навук.-папул. нарыс / Н.С. Гілевіч. – Мінск: Нар. асвета, 1968. – 214 с.
3. Лірычныя песні / уклад. і рэд. Н.С. Гілевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1976. – 464 с.
4. Беларускі фальклор: хрэстаматыя: вучэб. дапам. для філал. спец. выш. навуч. установ / склад.: К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 1996. – 856 с.
5. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падручнік для філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Выш. шк., 1988. – 415 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў / аўт. ідэі, агул. рэдаг. Т.Б. Варфаламеева // Брэсцкае Палессе / В.І. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2008. – Т. 4. – 559 с.
7. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Брэсцкая вобласць / склад.: В.А. Захарава [і інш.]; пад рэд. Р.Р. Шырмы. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1973. – 304 с.
8. Пропп, В.Я. Фольклор и действительность: избранные статьи / В.Я. Пропп. – М.: Наука, 1976. – 326 с.
9. Восточнославянский фольклор. Словарь научной и народной терминологии / отв. ред. К.П. Кабашников. – Минск: Наука и техника, 1993. – 478 с.
10. Можейко, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья: Село Тонеж / З.Я Можейко; ред. Е.В. Гиппиус; АН БССР, ИИЭиФ. – Минск: Наука и техника, 1971. – 264 с.
11. Карский, Е.Ф. Белорусы: в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Минск: БелЭн, 2007. – Т. 3, ч. 1: Очерки словесности белорусского племени. – 584 с.
12. Барыс, С. Беларускія гістарычныя песні / С. Барыс, В. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 2. – С. 38 – 42.
13. Чичеров, В. Вопросы теории и истории народного творчества / В.И. Чичеров. – М.: Сов. писатель, 1959. – 310 с.
14. Пушкарев, Л.Н. Духовный мир русского крестьянина по пословицам XVII – XVIII веков / Л.Н. Пушкарев; отв. ред. А.Н. Сахаров. – М.: Наука, 1994. – 192 с.
15. Носович, И.И. Белорусские песни / И.И. Носович. – СПб.: Тип. Майкова, 1874. – 236 с.
16. Сидельников, В.М. Поэтика русской народной лирики: пособие для вузов / В.М. Сидельников; под ред. Л.И. Тимофеева. – М.: Гос. уч.-пед. изд-во М-ва просвещения РСФСР, 1959. – 128 с.
17. Пушкарев, Л.Н. Письменные источники по изучению менталитета русского крестьянства XVIII в. / Л.Н. Пушкарев // Мировосприятие и самосознание русского общества (XI – XX вв.): сб. ст. / Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории. – М., 1994. – С. 76 – 83.

18. Сенько, И.М. Исторические песни славянских народов о событиях XIX века: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.01.09 / И.М. Сенько; ИИФЭ им. М.Ф. Рыльского АН УССР. – Минск, 1989. – 18 с.
19. Сенько, И.М. Исторические песни славянских народов о событиях XIX века: дис. ...канд. филол. наук: 10.01.09 / И.М. Сенько; ИИФЭ им. М.Ф. Рыльского АН УССР. – Киев, 1988. – 157 с.
20. Путилов, Б.Н. Русский историко-песенный фольклор XIII–XVI веков / Б.Н. Путилов; АН СССР, Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1960. – 300 с.
21. Людтке, А. Что такое история повседневности? Ее достижения и перспективы в Германии? / А. Людтке // Социальная история. Ежегодник. 1998 – 1999. – М.: РОССПЭН, 1999. – С. 77 – 100.
22. Иенс, М. Военное дело и народная жизнь / М. Иенс; пер. с нем. Шульмана; под ред. Пузыревского. – 2-е изд. – Варшава, 1990. – 434 с.
23. Лазутин, С.Г. Русские народные песни / С.Г. Лазутин. – М.: Просвещение, 1965. – 302 с.
24. Ахрыменка, П.П. Беларускія народныя песні і казкі / П.П. Ахрыменка; кніга адрэдаг. на грамад. пач. М.Р. Ларчанкам. – Мінск: Навука і тэхніка, 1965. – 160 с.
25. Беларусы / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Т. 7: Вусная паэтычная творчасць; Г.А. Барташэвіч [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 586 с.
26. Карамзин, Н.М. История государства российского: в 12 т. / Н.М. Карамзин. – СПб.: Иждивением книгопродавца Смирдина, 1933 – 1835. – Т. 10. – 1834. – 57 с.
27. Путилов, Б.Н. Вариативность в фольклоре / Б.Н. Путилов // Историко-этнографические исследования по фольклору: сб. науч. ст.; Рос. акад. наук, Ин-т востоковедения. – М.: Изд. фирма «Вост. лит.» РАН, 1994. – 276 с.
28. Гуревич, А.Я. Исторический синтез и школа «Анналов» / А.Я. Гуревич. – М.: Индрик, 1993. – 327 с.

*Пастуніў 17.12.2012*

## THE PROBLEM OF STUDYING OF GENRE VERSIONS AND FEATURES OF CLASSIFICATION OF BELARUSIAN, COSSACK, RECRUIT AND SOLDIER'S SONGS

*L. LUTS*

*The problem of genre version and the features of classification of Belarusian, Cossack, recruit and soldier's songs are investigated in the article. The systematization of the plots of the above mentioned songs and their ideological and art analysis allowed to mark out the common genre features of Cossack, recruit and soldier's songs. The proximity of theme, the fact of social accessory and a military factor were taken into account as the phenomenon of the objective reality and the features of art judgment of the world. These works are peculiar genre versions of social songs, but in total they make the complete phenomenon in the history of folklore. The general classification of Cossack, recruits and soldier's songs in accordance with functional thematic principle (family and household, social, historical and ballad songs) is given in the article. Such principle is based on a theme, plot and composition features of the system of image and graphic means as well as on a song functionality.*